## Што NEFCO можа прапанаваць тваёй кампаніі?

- шмат інструментаў фінансавання і канкурэнтна здольных пазык або інвестыцыйных капіталаў
- юрыдычную і фінансавую кампетэнцыю
- сур'ёзную экспертызу навакольнага ассяроддзя
- удзел NEFCO зніжае эканамічныя рызыкі інвесціравання і аблягчае ажыцяўленне праекта
- добрае веданне мясцовасці і доўгі вопыт фінансавання навакольнага ассяроддзя ў Расіі, Украіне, Беларусі, Эстоніі, Латвіі і Літве
- шырокая сетка кантактаў, якая ўключае мясцовыя ўлады, фінансавыя карпарацыі і кампаніі ў Скандынавіі і Усходняй Еўропе




NEFCO
NORDIC ENVIRONMENT FINANCE CORPORATION

Паўночная экалагічная фінансавая карпарацыя NEFCO
адрас: Fabianinkatu 34, Хельсінкі
паштовы адрас: PL 249, FI-00171, Хельсінкі, Фінляндыя
тэл.: +358 10 618003, факс +358 9 630976
www.nefco.org, info@nefco.fi

графічны дызайн: Amfibi Ky/Петры Клусіўс • фота: Патрык Растэнбергер • друкарня: DMP Oy • Аддрукавана на бумазе, сертыфіцыраванай ЛПС

# Апісанне з'яў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .





### Угнаенне як камерцыйны тавар

NEFCO прафінансавала два дзесяткі сельскагаспадарчых праектаў у Прыбалтыцы і Расіі ў рамках дзейнасці фонда кампаніі. Адным з апошніх дадаткаў да паляпшэння сельскагаспадарчага сектара стаў праект ва Украіне, дзе NEFCO супрацоўнічае з украінскай кампаніяй Nalychyna Zahid, якая ў 2001 годзе выкупіла свінаферму, якая мадэрнізуецца і абнаўляецца з дапамогай замежнага фінансавання. NEFCO фінансуе гэты праект сродкамі з інвестыцыйнага фонда кампаніі.

Свінаферма знаходзіцца каля вёскі Кавске, што ляжыць прыкладна 70 кіламетраў на паўднёвы захад ад Львова. Двор мае магчымасць змяшчаць усяго 1800 свінней.

NEFCO фінансуе апрача ўсяго біягазавыя рэактары, якія генерыруюць энергію для ацяплення, а таксама энергаэканомную вентыляцыю ў будынках свінафермы. Такім чынам, інвестыцыі спрыяюць як здароўю і дабрабыту свінней, так і клімату. Пераход ад гаручага топліва да біягазу па падліках дапамагае кампаніі зберагаць 670000 еўра ў год. Гэты праект валодае таксама іншым удачным экалагічным эфектам: мадэрнізацыя свінафермы спрыяла манціроўцы старога ізаляцыйнага матэрыяла, які змяшчаў азбест, які правакуе рак.

### Праблiск у металаапрацоўчай прамысловасці

Neva Ferrit Ltd. размяшчаецца у Санкт-Пецярбурзе і з'яўляецца дачэрняй кампаніяй канцэрна Ferropribor, які выраблае розныя феррамагнітныя прадукты для рускай металаапрацоўчай прамысловасці.

NEFCO адобрыла пазыку, дзякуючы чаму з'явілася магчымасць для закупкі новай печы, якую ўстанавілі ў тым жа годзе. Усяго былі заменены на сучасныя 13 састарэлых пячэй кампаніі. Гэтая пазыка была выдадзена Фондам дасягнення больш чыстай вытворчасці карпарацыі NEFCO (Revolving Facility for Cleaner Production), які з'яўляецца адной з частак Паўночнага фонда развіцця экалогіі.

Дзякуючы інвестыцыям аб'ём фабрычных выкідаў вуглякіслага газу зменьшыўся прыкладна на 430 тон у год апасля таго, як новыя печы ўвайшлі ў карыстанне. А выкіды сернага газу, пасля украненння новай экалагічнай тэхнікі, наогул засталіся толькі ва ўспамінах.

Дзякуючы зніжанаму расходаванню энергіі Neva Ferrit Ltd. зберагае прыкладна 179 000 еўра ў год, што вызваляе капітал для пагашэння пазыкі, выдадзенай кампаніяй NEFCO. Агульны кошт інвесціравання ў праект склаў 490 000 еўра.







NEFCO
NORDIC ENVIRONMENT FINANCE CORPORATION

# Фінансаванне для паляпшэння навакольнага асяроддзя









# КОРАТКА АБ NEFCO

Паўночная экалагічная фінансавая карпарацыя (NEFCO) - гэта міжнародная фінансавая арганізацыя, заснаваная ў 1990 годзе пяццю скандынаўскімі краінамі: Даніяй, Фінляндыяй, Ісландыяй, Нарвегіяй і Швецыяй. У першую чаргу NEFCO ставіць сабе за мэту фінансаванне акупляемых экалагічных праектаў у сумежных да Скандынавіі ўсходнееўрапейскіх краінах. Штаб-кватэра NEFCO размяшчаецца ў Хельсінкі і знаходзіцца ў цеснай сувязі з Паўночным інвестыцыйным банкам (NIB).

NEFCO кіруе большай часткай экалагічных фондаў, якія выкарыстоўваюцца для фінансавання экалагічных праектаў у Расіі, Украіне і Беларусі, а таксама, часова, у краінах Балтыі – Эстоніі, Латвіі і Літве. Апрача ўсяго, NEFCO распачала пілотны праект у Кітаі. NEFCO фінансуе праекты, мэта якіх - зніжэнне шкодных выкідаў, такіх як парніковыя газы або экалагічна шкодныя рэчыва. Значная частка праектаў, якія фінансуюцца NEFCO, накіравана на скарачэнне выкідаў мінеральных рэчываў у Балтыйскае мора, што супрацьдзейнічае эутрафікацыі.

Мы прапануем кампаніям і муніцыпальным акругам пазыкі, субардыніраваныя пазыкі і мяккія крэдыты, якія інвестуюцца ў экалагічныя праекты ў межах дзейнасці арганізацыі NEFCO. У некаторых выпадках NEFCO можа выступаць адным з саўладальнікаў мясцовых прадпрыемстваў, якія дабіваюцца рэалізацыі экалагічных праектаў у тых краінах, на якія распаўсюджваюцца інтарэсы карпарацыі. NEFCO звяртаецца да паслуг мясцовых кансультантаў у Санкт-Пецярбурзе, Ноўгарадзе, Кіеве і Данецку для таго, каб знайсці новых партнёраў для супрацоўніцтва і інвестараў у Расіі і Украіне.

Кожны праект, які прэтэндуе на фінансаванне з боку кампаніі NEFCO, павінен адпавядаць такім экалагічным крытэрыям, якія б давалі магчымасць колькаснага выяўлення скарачэння выкідаў. Больш інфармацыі аб гэтых крытэрыях можна знайсці на нашым афіцыйным сайце www.nefco.org. Кожная заява на праект аналізуецца юрыстам кампаніі NEFCO, супрацоўнікамі, адказнымі па разгляду, і экспертамі па навакольнаму ассяроддзю да таго, як будзе разгледжана інвестыцыйным камітэтам кампаніі. Пастанова аб адабрэнні пазыкі прымаецца кіраўніцтвам карпарацыі NEFCO, у якое ўваходзюць прадстаўнікі ўсіх пяцці скандынаўскіх  краін.

Фонды і сістэма заёмаў кампаніі NEFCO




# НАШЫ ВАЖНЕЙШЫЯ ФОНДЫ

## Інвестыцыйны фонд (IF)

З капіталам у 113, 4 мільёна еўра NEFCO мае магчымасць прымаць удзел у эканамічна рэнтабельных праектах, выступаючы ў якасці саўладальніка, заёмадаўцы або гаранта. Праекты павінны мець рэлевантную экалагічную эфектыўнасць для таго, каб атрымаць фінансаванне з боку Інвестыцыйнага фонду. Мы аддаем перавагу, у першую чаргу, экалагічна эфектыўным праектам, рэалізацыя якіх будзе спрыяць паляпшэнню стану навакольнага асяроддзя ў краінах Скандынавіі. Гэта падразумевае тое, што важнейшую ўвагу атрымліваюць меры, дзякуючы якім скарачаецца аб'ём выкідаў шкодных рэчываў у рэкі і азёры, а таксама абмяжоўваецца перавышэнне выкідаў парніковых газаў і выкідаў, якія пераносяцца паветрам.

Фінансаванне прадугледжвае тое, што супрацоўніцтва са скандынаўскім партнёрам будзе працягвацца і ў будучым. Гэта можа рэалізоўвацца ў форме прадпрыемства ў любым з відаў – ад прамога інвесціравання да праектаў па ўзаемадзеянню, якія ахопліваюць доўгія перспектывы. Акрамя гэтага можа абмяркоўвацца скандынаўская мадэль узаемадзеяння камунальнага сектару ў ролі інвестара.

NEFCO прадугледжвае тое, што праекты адпавядаюць зручнаму патрабаванню прыбытковасці, але надае большае значэнне дасягненню вынікаў у працэссе паляпшэння стану навакольнага асяроддзя. NEFCO заўсёды расследуе тэхнічнасць рэалізацыі і эканамічную прыбытковасць праекта. Інвестыцыйны фонд выдае капіталаінвестыцыі або пазыкі па рыначных працэнтах. Максімальны памер пазыкі, якую можа атрымаць праект, звычайна састаўляе 4 мільёна еўра. У капіталаінвестыцыях фінансавы пай карпарацыі NEFCO не можа перавышаць 50 працэнтаў ад агульнага інвесціравання або 30 працэнтаў ад акцыйнага капіталу.

## Паўночны фонд развіцця экалогіі (NMF)

Паўночны фонд развіцця экалогіі мае агульны капітал у 60 мільёнаў еўра. NMF – гэта фінансавая сістэма для так званнага мяккага фінансавання, або, іншымі словамі, пазык, якія маюць больш выгадную рэнту ў параўнанні з існуючымі рыначнымі ўмовамі. Мэта фонда - ўмацоўваць патрабаванне рэнтабельнасці ад значных экалагічных праектаў, спрыяць больш надзейнаму фінансаванню, пераносіць на больш ранні тэрмін ажыццяўленне праектаў або падтрымліваць дадатковыя інвестыцыі ў навакольнае асяроддзе.

Асноўная частка ўзносаў, якія выдаюцца Паўночным фондам развіцця экалогіі, на сёння праводзіцца ў форме так званных аднаўляемых механізмаў фінансавання, пры якіх сродкі павінны быць выплачаны назад да NMF, што захоўвае капітал фонду і надае магчымасць для арганізацыі новых праектаў. Акрамя гэтага можна згадаць льготныя сістэмы крэдытаў для больш чыстых тэхналогій, энергазберажэнне і інвестыцыі ў экалогію сельскай гаспадаркі. Гэтыя тэхнічныя вырашэнні павінны будавацца на лепшых даступных тэхналогіях, аднак жа з увагай да існуючых эканамічных умоў, і прыстасоўвацца да мясцовых рэалій. Закупка абсталявання і паслуг, якая фінансуецца праз фонд NMF, можа адбывацца на скандынаўскім, мясцовым або міжнародным рынках канкурэнцыі прапаноў.

Максімальны ўзнос, які можа атрымаць асобны праект, складае суму ў 90 працэнтаў або 400 000 еўра ад кошту інвесціравання ў праекты, якія фінансуюцца сродкамі са зваротных крэдытных сістэм.

## Вугляродныя фонды TGF і NeCF

Карпарацыя NEFCO кіруе двума вугляроднымі фондамі, якія фінансуюць праекты, якія процідзейнічаюць глабальнаму пацяпленню. TGF (Фонд па рэалізацыі прыродаахоўных праектаў у гарачых рэгіёнах Барэнцава мора) – гэта рэгіянальны фонд клімату, у якім прыватны і дзяржаўны капітал аб'ядноўваюцца для кліматычных інвестыцый. Капітал фонду дасягае 35 мільёнаў еўра. Мэта фонда - купля выгадных кліматычных крэдытаў для сваіх інвестараў. TGF фінансуе так званы праект "Сумесная рэалізацыя" (Joint Implementation)  у рамках Кіёцкага дагавору праз куплю крэдытаў на выкіды. Фокус фонду знаходзіцца на энергітычных праектах у Эстоніі, Латвіі, Літве, Польшчы, Расіі і Украіне. Інвестарамі ў TGF яўляюцца скандынаўскія краіны, Германія і дзевяць прыватных кампаній.

Вугляродны фонд NEFCO (NeCF) – глабальны вугляродны фонд, арганізаваны ў красавіку 2008 года. Агульны капітал фонду складае 72 мільёна еўра. NeCF робіць магчымым інвесціраванне ў праекты, ажыцяўленне якіх зніжае ўзровень выкідаў у атмасферу згодна гібкім механізмам Кіёцкага пратаколу. NeCF адрасаваны, у першую чаргу, інвестарам, якія маюць кліматычныя абязацельствы ў рамках гандлёвай сістэмы Еўрапейскага Саюза па кантролю за выкідамі (EU Emission Trading Scheme).

Фонд NeCF фінансуе экалагічныя праекты, якія адпавядаюць патрабаванням Кіёцкага пратаколу па так званым "Сумесны рэалізацыі" (Joint Imlepentation) або "Механізму чыстага развіцця" (Clean Development Mechanism). На практыцы гэтыя праекты займаюцца энергаэфектывізацыяй або укладаннямі ў аднаўляемыя крыніцы энергіі. Вугляродныя фонды TGF і NeCF адміністрыруюцца карпарацыяй NEFCO, але маюць уласныя інвестыцыйныя камітэты, якія кіруюцца прадстаўнікамі асобных інвестараў.




РАЗМЕРКАВАННЕ ЗГОДНА ІНТАРЭСАМ СКАНДЫНАЎСКІХ КРАІН




СЕКТАРНАЕ РАЗМЕРКАВАННЕ






РАЗМЕРКАВАННЕ ЗГОДНА З КРАІНАМІ ВЫТВОРЧАСЦІ




СЕКТАРНАЕ РАЗМЕРКАВАННЕ

